Т. Наварыч

# БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ АНТАЛОГІЯ



## да 50-годдзя з пачатку выдання бюлетэня «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку»

У чэрвені гэтага года Нацыянальная бібліятэка Беларусі адзначыла юбілей бюлетэня «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку», які па праву можна назваць бібліяграфічным летапісам жыцця краіны. На працягу паўстагоддзя выданне выконвае функцыі надзейнага компаса ў моры навінак айчыннага друку, добрага дарадчыка і незаменнага памочніка для бібліятэкараў і бібліёграфаў, спецыялістаў у розных галінах, навучэнцаў, абітурыентаў і студэнтаў. За час існавання паказальніка на яго старонках была апублікавана вялікая колькасць карысных і цікавых бібліяграфічных матэрыялаў. Калі сабраць усе нумары бюлетэня за 50 гадоў (а іх каля 600), то атрымаецца сапраўдная бібліяграфічная анталогія.

Гісторыя «Новых кніг...» пачынаецца ў чэрвені 1960 г., калі пад кіраўніцтвам першага дырэктара Дзяржбібліятэкі БССР (сёння Нацыянальная бібліятэка Беларусі) І.Б. Сіманоўскага выйшаў з друку першы нумар бюлетэня пад назвай «Новыя кнігі БССР» [1]. Паказальнік быў прызначаны для бібліятэчных і


НОВЫЯ КНІГІ БССР

1960

1

(чэрвень)

кнігагандлёвых работнікаў, а таксама для шырокага кола чытачоў, якія цікавіліся навейшай літаратурай па ўсіх галінах ведаў [5, с. 7]. Бюлетэнь інфармаваў аб навінках беларускіх і ўсесаюзных выдавецтваў, аб кнігах, што рыхтаваліся да выпуску ў бліжэйшыя два-тры месяцы. У паказальніку адлюстроўваліся цікавыя і каштоўныя кнігі пра Беларусь, уключаліся рэцэнзіі на новыя беларускія выданні, якія атрымалі станоўчую адзнаку [5, с. 7]. На старонках бюлетэня пад назвай «Памятныя даты» друкаваўся каляндар знамянальных і памятных дат рэспубліканскага значэння, дзе змяшчаліся матэрыялы да юбілеяў асоб, якія пакінулі значны след у гісторыі і культуры Беларусі, асвятляліся важнейшыя падзеі мінулага, а таксама з палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця краіны [5, с. 9]. Акрамя бібліяграфічных матэрыялаў у паказальнік уключалася інфармацыя аб новых з'явах і падзеях у бібліятэчным жыцці рэспублікі: найбольш цікавых масавых мерапрыемствах, семінарах бібліятэчных работнікаў і інш. [1]. Таксама ў дапаможніку друкаваліся метадычныя матэрыялы па розных пытаннях бібліятэчнай дзейнасці [5, с. 7]. На старонках паказальніка і ў дадатках да яго публікаваліся рэкамендацыйныя бібліяграфічныя спісы па прыродазнаўстве, тэхніцы, мастацкай літаратуры і мастацтве, а таксама па актуальных пытаннях таго часу. У дадатках змяшчаліся і анатаваныя спісы новых метадычных і бібліяграфічных дапаможнікаў, гутаркі аб найбольш цікавых і карысных новых кнігах, агляды твораў беларускай мастацкай літаратуры [1]. У мэтах аказання дапамогі масавым бібліятэкам у планаванні работы друкаваліся план дадаткаў і пералік асноўных дат беларускага календара на наступны год. У кожным дванаццатым нумары паказальніка змяшчаўся спіс «Матэрыялы, апублікаваныя ў бюлетэні "Новыя кнігі БССР" у... годзе», дзе адлюстроўваліся дадаткі да выдання, кароткія спісы літаратуры і матэрыялы да памятных дат [1].

На працягу трыццаці гадоў змест «Новых кніг БССР» заставаўся амаль без змяненняў, але ў пачатку 1990-х гг. пасля ўтварэння самастойнай Рэспублікі Беларусь беларусазнаўчая тэматыка стала вядучай [1]. На старонках выдання рабілася спроба зазірнуць у мінулае краіны, асэнсаваць гісторыю і культуру беларускага народа [10, с. 48]. У гэты час адбыліся

змены ў структуры паказальніка. Так, у 1991 г. у раздзел «Навінкі беларускага друку» былі ўведзены наступныя рубрыкі: «Пра Беларусь і беларусаў», «Папулярна аб усім», «Мастацкая літаратура», «Кнігі – дзецям», «У дапамогу прафесійнаму чытанню» [1]. Змяніўся і змест раздзела: у ім знайшлі адлюстраванне не толькі кнігі, але і артыкулы з рэспубліканскіх перыядычных выданняў [1]. Перамены закранулі і даведачны апарат бюлетэня: у яго склад увайшлі персанальны, геаграфічны і прадметна-тэматычны дапаможныя паказальнікі да раздзела «Навінкі беларускага друку». Змены ў змесце паказальніка адбіліся і на яго назве: у 1992 г. ён быў перайменаваны ў «Новыя кнігі Беларусі». Сучасная назва бюлетэня з'явілася ў 1995 г. [1].

Ужо ў першыя гады свайго існавання выданне стала неабходным дапаможнікам для бібліятэк краіны пры камплектаванні і дакамплектаванні фондаў, планаванні работы, кіраўніцтве чытаннем, у даведачнай і інфармацыйнай дзейнасці [2, с. 5]. Вялікім попытам карысталіся рэкамендацыйныя бібліяграфічныя спісы і раздзел «Памятныя даты». Бібліятэкары называлі «Новыя кнігі…» «каштоўным дапаможнікам», «самым патрэбным з рэспубліканскіх выданняў, якое аказвае дзейсную практычную дапамогу» і г. д. [2, с. 5]. І сёння бюлетэнь з'яўляецца адным з самых папулярных бібліяграфічных выданняў краіны [4, с. 24]. Ён паспяхова ўжываецца ў бібліятэках рэспублікі пры бібліяграфічным абслугоўванні чытачоў, арганізацыі выставак, правядзенні масавых мерапрыемстваў, дакамплектаванні фондаў, вядзенні даведачна-бібліяграфічнага апарату і г. д. Паказальнік дапамагае карыстальнікам лёгка арыентавацца ў патоку новых беларускіх кніг і публікацый у перыядычным друку, знаёміць з бібліяграфічнымі матэрыяламі па грамадска значных і актуальных тэмах, прапануе цікавы матэрыял да дат беларускага календара. Дапаможнік складаецца з пастаянных раздзелаў: «Навінкі беларускага друку» і «У полі зроку рэцэнзента» [1]. Першы раздзел інфармуе аб найбольш значных навінках айчыннага друку на беларускай і рускай мовах. У раздзел уключаюцца кнігі беларускіх выдавецтваў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама артыкулы з рэспубліканскіх часопісаў і газет «Літаратура і Мастацтва» і «Культура» [3, с. 2]. Інфармацыя падаецца ў шасці падраздзелах. У падраздзеле «Што чытаць пра Беларусь» адлюстроўваюцца матэрыялы, прысвечаныя гісторыі, культуры, прыродзе Беларусі, роднай мове, спорту, а таксама знакамітым ураджэнцам і дзеячам краіны. Спецыялістам у розных галінах прызначаны падраздзел «У дапамогу прафесійнаму чытанню». Добрым навігатарам па навучальнай і даведачнай літаратуры з'яўляецца рубрыка «У дапамогу абітурыенту». Падраздзел «Папулярная літаратура і літаратура для самаадукацыі» прапануе літаратуру па ўсіх галінах ведаў. Падраздзел «Мастацкая літаратура» ўключае звесткі пра кнігі і часопісныя публікацыі раманаў, аповесцей, п'ес, паэм. Аб новых выданнях дзіцячай мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры інфармуе падраздзел «Кнігі і публікацыі – дзецям» [1]. Бібліяграфічныя звесткі ў некаторых выпадках дапаўняюцца кароткімі анатацыямі. У іх выносяцца геаграфічныя назвы, прозвішчы, даты, удакладняецца тэма публікацыі, што дазваляе чытачу зарыентавацца ў мностве матэрыялаў, якія прапануюцца, і выбраць неабходныя дакументы [1]. Раздзел «У полі зроку рэцэнзента» паведамляе пра рэцэнзіі з айчыннага перыядычнага друку на выданні, уключаныя ў «Навінкі беларускага друку» [3, с. 3].




Асобае месца ў бюлетэні займаюць дадаткі, якія выходзяць пад адной вокладкай з выданнем і з'яўляюцца добрай падтрымкай не толькі для бібліятэкараў і бібліёграфаў, але і выкладчыкаў, настаўнікаў, педагогаў-арганізатараў, культработнікаў, студэнтаў. Асобныя нумары дадаткаў змяшчаюць «Беларускі каляндар, ...год», што прадстаўляе сабой пералік найбольш значных юбілейных і памятных дат, якія будуць адзначацца ў наступным годзе [1]. Спіс фарміруецца на аснове універсальнай беларусазнаўчай базы даных «Беларусь у асобах і падзеях». Больш поўная версія календара змяшчаецца ў штогоднім электронным выданні «Беларускі каляндар, …год», фактаграфічныя звесткі ў якім дапаўняюцца ілюстрацыйным матэрыялам (фотаздымкамі асоб, выявамі гербаў, лагатыпамі арганізацый і інш.) і спасылкамі на найбольш каштоўныя і цікавыя афіцыйныя web-сайты [15]. У якасці дадатку ў бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» сістэматычна друкуюцца «Даты беларускага календара», дзе змяшчаюцца матэрыялы, прысвечаныя буйнейшым установам і знакамітым дзеячам Беларусі, а таксама грамадска значным падзеям у культурным жыцці краіны [1]. Памятныя даты складаюцца з даведак і спісаў літаратуры. За год у бюлетэні публікуецца больш за сорак такіх юбілейных артыкулаў. Калі скласці іх усе, то ў выніку атрымаецца каштоўны бібліяграфічны даведнік. Пэўная частка дадаткаў – вялікія па аб'ёме анатаваныя бібліяграфічныя спісы па актуальных і грамадска значных тэмах (напрыклад, «Цуд некранутай прыроды: да 600-годдзя ўстанаўлення ў Белавежскай пушчы запаведнага рэжыму» (2009, № 9), «Да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа» (2007, № 4), «Слава і гонар Беларусі: да 520-годдзя з дня нара-

джэння мысліцеля-асветніка, гуманіста і першадрукара Ф. Скарыны» (2010, № 7), «Свяшчэннай памяццю авеяныя гады: да 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне» (2010, № 3), «Нацыянальная бібліятэка Беларусі на шляху развіцця: да адкрыцця новага будынка» (2005, № 8) і інш.). У падрыхтоўцы матэрыялаў да памятных дат і тэматычных бібліяграфічных спісаў прымаюць удзел рэспубліканскія і абласныя бібліятэкі краіны. Так, да дадатку пад назвай «Бібліятэкі – юбіляры 2010 года» буйнейшыя бібліятэкі Беларусі падрыхтавалі спісы літаратуры і цікавыя артыкулы, прысвечаныя іх гісторыі, сучаснаму стану і асноўным напрамкам дзейнасці [1]. Сярод пастаянных аўтараў дадаткаў да бюлетэня трэба адзначыць Навукова-педагагічную бібліятэку, якая штогод публікуе бібліяграфічныя спісы: «Одаренные дети: их особенности и организация работы с ними», «Метадычная літаратура – настаўніку-прадметніку», «Інавацыйная дзейнасць ва ўстановах адукацыі», «Профільнае навучанне ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі» і інш. [1].

У кожным дванаццатым нумары бюлетэня змяшчаюцца дапаможныя паказальнікі і раздзел «Матэрыялы, апублікаваныя ў "Новых кнігах" у ... годзе», які адлюстроўвае матэрыялы да памятных дат і бібліяграфічныя спісы, што былі надрукаваны на старонках паказальніка за год [1]. Пры выяўленні беларусазнаўчай і краязнаўчай інфармацыі выкарыстоўваецца геаграфічны дапаможны паказальнік, для пошуку звестак аб знакамітых асобах – персанальны. Навігатарам па літаратуры па розных галінах ведаў з'яўляецца прадметны паказальнік. Пералік тэматычных дадаткаў на наступны год публікуецца ў дванаццатым нумары бюлетэня [1].

Гэты артыкул будзе няпоўным, калі не ўзгадаць складальнікаў і рэдактараў бюлетэня, дзякуючы руплівасці і самаадданасці якіх выданне прайшло выпрабаванне часам. Некалькі пакаленняў бібліёграфаў бібліятэкі ўнеслі значны ўклад ва ўдасканаленне структуры дапаможніка, яго зместу і методыкі складання. Матэрыялы для паказальніка складаліся супрацоўнікамі розных структурных падраздзяленняў бібліятэкі: навукова-метадычнага і рэдакцыйна-выдавецкага аддзелаў, аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі [5]. На працягу паўстагоддзя працу над «Новымі кнігамі...» узначальвае навукова-даследчы аддзел бібліяграфіі, у складзе якога паспяхова функцыянуе група рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Ля вытокаў «Новых кніг...» стаялі Н.В. Каляда і заслужаны дзеяч культуры Беларусі А.П. Дземчанкава, якія здзяйснялі агульную рэдакцыю бюлетэня [1]. У першыя гады існавання дапаможніка складаннем бібліяграфічных матэрыялаў займаліся Ф.І. Мільчына, В.Н. Дышыневіч, Т.І. Грынкевіч, Р.І. Кулагіна і інш. [1]. Больш за трыццаць гадоў прысвяцілі бюлетэню выдатныя бібліёграфы А.В. Мураўёва (за заслугі ў развіцці бібліятэказнаўства і шматгадовую плённую працу была ўзнагароджана медалём Францыска Скарыны), М.А. Каваленка, А.І. Леў, Т.К. Лазарук, Т.Я. Мамедава, К.Дз. Варанько, І.В. Нарчук і інш. [1]. Каля дваццаці гадоў складаннем і рэдагаваннем матэрыялаў для бюлетэня займалася З.Л. Елісавецкая, больш за дзесяць гадоў над бюлетэнем працавалі ветэран Вялікай Айчыннай вайны В.М. Сіленка, а таксама Г.І. Антонава, Г.В. Брага, В.У. Ліхімовіч і інш. [1]. Дзякуючы плённай працы гэтых высокакваліфікаваных спецыялістаў «Новыя кнігі...» набылі аўтарытэт сярод беларускіх чытачоў. Паказальнік паспяхова прымяняецца ў прафесійнай, адукацыйнай, самаадукацыйнай дзейнасці і для арганізацыі вольнага часу. Аператыўны выхад у свет, даступнасць для набыцця, наяўнасць цікавых рубрык, добрага даведачнага апарату, раскрыццё грамадска значных і актуальных тэм у дадатках робяць выданне каштоўнай беларусазнаўчай крыніцай інфармацыі.

ЛІТАРАТУРА


1. **Новыя** кнігі : па старонках беларускага друку : штомес. бібліягр. бюлетэнь / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2004 – . – 12 вып. у год. – Выд. з 1960 г.

2. **Праз выпрабаванне** часам : да 50-годдзя з пачатку выдання бібліяграфічнага бюлетэня «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» / склад. Т. В. Наварыч ; рэд.: К. Дз. Варанько, І. В. Нарчук // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. – 2010. – № 6. – С. 2–10 дадатку, паміж с. 12–13.

3. **Ад рэдакцыі** // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. – 2010. – № 1. – С. 2–3.

4. **У чэрвені** – 40 год з пачатку выдання (1960) штомесячнага бібліяграфічнага бюлетэня Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Новыя кнігі» // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. – 2000. – № 2. – С. 24–26 дадатку, паміж с. 12–13.

5. **Демченкова, А. П.** «Новые книги БССР» / А. П. Демченкова, Г. Ф. Гришина // Советская библиография. – 1962. – № 6. – С. 7–11.

6. **Лявончыкаў, В. Е.** Беларуская бібліяграфія : агульны курс : падруч. для студэнтаў ін-таў культуры па спец. 05.26 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» / В. Е. Лявончыкаў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1991. – 262 с.
Гл. на с. 152–153, 185–186, 188–192.

7. **Зыгмантович, С. В.** Библиографический поиск в системе белорусской рекомендательной библиографии / С. В. Зыгмантович, В. И. Саитова // Вопросы библиографоведения и библиотековедения : межведомств. сб. –Минск, 1993. – Вып. 14. – С. 27–37.
См. на с. 30–32.

8. **Зыгмантович, С. В.** Комплексные популярные библиографические пособия / С. В. Зыгмантович // Подготовка библиографической продукции библиотеками : науч.-практ пособие / С. В. Зыгмантович. – Минск, 2009. –С. 122–124.

9. **Саитова, В. И.** О повышении роли рекомендательных библиографических пособий в справочно-библиографическом обслуживании и комплектовании фондов библиотек БССР / В. И. Саитова // Вопросы библиографоведения и библиотековедения : межведомств. сб. – Минск, 1991. – Вып. 12. – С. 74–82.
См. на с. 75–77, 80.

10. **Мураўёва, А. В.** «Новыя кнігі Беларусі» – крыніца інфармацыі пра Беларусь / А. В. Мураўёва // Бібліятэка і нацыянальная праграма «Спадчына» : матэрыялы навук.-практ. канф. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Дзярж. б-ка Рэсп. Беларусь ; [рэд. І. А. Прылішч]. – Мінск, 1992. – С. 46–49.

11. **Мотульский, Р. С.** Национальная библиотека Беларуси : учеб. пособие для вузов / Р. С. Мотульский ; Нац. б-ка Беларуси, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : [Национальная библиотека Беларуси], 2009. – 131 с.
См. на с. 43.

12. **Варанько, К.** «Новыя кнігі : па старонках беларускага друку» / Кацярына Варанько // Роднае слова. – 2004. – № 7. – С. 92.

13. **Нарчук, І. В.** Па старонках бюлетэня «Новыя кнігі» / І. В. Нарчук // Адукацыя і выхаванне. – 2001. – № 2. – С. 76–78.

14. **Нарчук, І. В.** Што чытаць пра Беларусь : (парады бібліёграфа) / І. В. Нарчук // Адукацыя і выхаванне. – 1995. – № 12. – С. 111–112.

15. **Беларускі** каляндар, ...год [Электронны рэсурс] / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2004. – . – 1 вып. у год. – Выд. з 2004 г. – Загаловак з тытульнага экрана.

## Summary

*The article tells about the history, structure and purpose of the bulletin «New books: Belarusian printing», published by the National Library of Belarus for already fifty years.*